*І. У. Таяноўская*

# ТЭСТАВЫЯ ЗАДАННІ ПА РЫТОРЫЦЫ ДЛЯ СПЕЦЫЯЛЬНАСЦІ 1–21 05 01 БЕЛАРУСКАЯ ФІЛАЛОГІЯ ПА ТЭМЕ "РЫТАРЫЧНАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ НА ЭТАПЕ ВЫНАХОДНІЦТВА: РАСПРАЦОВАЧНАЯ СТАДЫЯ"

## Варыянт 1

1. Вас чакае адказнае выступленне. Лепш пачынаць рыхтавацца:

а) напярэдадні ўвечары;

б) адразу пасля таго, як зрабілася вядома пра неабходнасць выступіць;

в) за два-тры дні да выступлення;

г) за тры-чатыры дні да выступлення.

2. Пры падрыхтоўцы зместу прамовы трэба ў першую чаргу звяртацца да такой крыніцы, як:

а) набыванне вопыту ў адпаведнай галіне;

б) адпаведныя назіранні;

в) роздум, прыпамінанне, уяўленне;

г) кансультаванне з дасведчанымі асобамі;

д) чытанне літаратуры па тэме;

е) карыстанне электроннай сеткай Internet.

3. Каталог, які групуе літаратуру па ключавых паняццях, завецца:

а) сістэматычным;

б) прадметным;

в) тэматычным.

4. Рэфератыўныя часопісы звычайна змяшчаюць:

а) бібліяграфічныя апісанні крыніц;

б) сцiслыя звесткі пра змест крыніц;

в) праспекты будучых выданняў;

г) энцыклапедычныя даведкі аб ужытых ключавых паняццях.

5. Выбярыце, у якім парадку больш мэтазгодна звяртацца да наступных крыніц матэрыялу для выступлення:

а) манаграфія 1972 г. выдання; манаграфія 1998 г. выдання; падручнік для ВНУ, адзін з раздзелаў якога прысвечаны тэме выступлення; метадычны дапаможнік для выкладчыкаў, частка якога змяшчае парады па арганізацыі навучання студэнтаў дадзенай тэме; навукова-папулярная брашура; аспектны артыкул па аднаму з пытанняў тэмы;

б) аспектны артыкул па аднаму з пытанняў тэмы; манаграфія 1972 г. выдання; навукова-папулярная брашура; манаграфія 1998 г. выдання; метадычны дапаможнік для выкладчыкаў, частка якога змяшчае парады па арганізацыі навучання студэнтаў дадзенай тэме; падручнік для ВНУ, адзін з раздзелаў якога прысвечаны тэме выступлення;

в) аспектны артыкул па аднаму з пытанняў тэмы; манаграфія 1998 г. выдання; манаграфія 1972 г. выдання; метадычны дапаможнік для выкладчыкаў, частка якога змяшчае парады па арганізацыі навучання студэнтаў дадзенай тэме; падручнік для ВНУ, адзін з раздзелаў якога прысвечаны тэме выступлення; навукова-папулярная брашура;

г) падручнік для ВНУ, адзін з раздзелаў якога прысвечаны тэме выступлення; аспектны артыкул па аднаму з пытанняў тэмы; манаграфія 1972 г. выдання; манаграфія 1998 г. выдання; навукова-папулярная брашура; метадычны дапаможнік для выкладчыкаў, частка якога змяшчае парады па арганізацыі навучання студэнтаў дадзенай тэме;

д) падручнік для ВНУ, адзін з раздзелаў якога прысвечаны тэме выступлення; манаграфія 1998 г. выдання; манаграфія 1972 г. выдання; аспектны артыкул па аднаму з пытанняў тэмы; навукова-папулярная брашура; метадычны дапаможнік для выкладчыкаў, частка якога змяшчае парады па арганізацыі навучання студэнтаў дадзенай тэме.

6. Рыхтуючы прамову, трэба:

а) розныя крыніцы чытаць з рознай хуткасцю;

б) усе крыніцы імкнуцца чытаць аднолькава старанна і ўважліва;

в) чытаць усе крыніцы аднолькава ўважліва, калі рыхтуецца больш адказнае выступленне.

7. Вядзенне запісаў па прачытанаму часцей:

а) узнімае прадуктыўнасць разумовай працы;

б) зніжае прадуктыўнасць разумовай працы;

в) істотна не змяняе прадуктыўнасці разумовай працы.

8. Вызначце, у якім з выпадкаў правільна падзелены спосабы чытання, якія вылучаюцца па розных крытэрыях:

а) праглядальнае, азнаямляльнае, вывучальнае; выбіральнае, цэласнае, хуткаснае;

б) праглядальнае, азнаямляльнае, вывучальнае; выбіральнае, цэласнае; хуткаснае;

в) праглядальнае, выбіральнае, азнаямляльнае, вывучальнае; хуткаснае, цэласнае;

г) праглядальнае, вывучальнае; выбіральнае, азнаямляльнае, цэласнае; хуткаснае;

д) праглядальнае, азнаямляльнае, вывучальнае; выбіральнае, цэласнае; хуткаснае.

9. Пра добрую распрацаванасць аргументацыі ў кнізе звычайна сведчаць:

а) малыя абзацы;

б) буйныя абзацы;

в) абзацы сярэдняга памеру.

10. Пры чытанні найбольш эфектыўны рух вачэй:

а) вертыкальны па сярэдзіне старонкі;

б) з прыпынкамі па кожнаму радку;

в) зігзагападобны ад радка да радка.

11. Азнаямляльным чытаннем часцей за ўсё абмяжоўваюцца пры знаёмстве з тэкстамі:

а) навуковымі;

б) навучальнымі;

в) навукова-папулярнымі;

г) мастацкімі;

д) публіцыстычнымі.

12. Калі пры вывучэнні літаратуры сустракаюцца недаследаваныя ці неадназначна вырашаныя праблемы, у выступленні варта:

а) абмінуць недаследаваныя і спрэчныя пытанні;

б) абмінуць недаследаваныя пытанні, аднак спыніцца на вырашаных неадназначна;

в) адзначыць недаследаваныя пытанні, але абмінуць спрэчныя;

г) завастрыць увагу на недаследаваных і неадназначна вырашаных пытаннях.

13. Паміж асобнымі структурнымі часткамі тэзісаў:

а) павінна назірацца лагічная сувязь;

б) павінна назірацца моўная сувязь;

в) павінна назірацца і лагічная, і моўная сувязь;

г) і лагічная, і моўная сувязь звычайна не з’яўляюцца абавязковымі.

14. Галоўная інфармацыя сказа ў славянскіх мовах:

а) можа з роўнай ступенню верагоднасці знаходзіцца і ў пачатку, іў канцы сказа;

б) часцей знаходзіцца у пачатку сказа;

в) часцей знаходзіцца у канцы сказа.

15. Як правіла, у канспектах адлюстроўваюцца:

а) паўторы думак;

б) азначэнні;

в) адхіленні;

г) правілы;

д) фармулёўкі заканамернасцей.

16. Вызначце лагічна апраўданы парадак граф канспекта пры запісе ў таблічнай форме:

а) план, асноўныя палажэнні, прыклады, заўвагі;

б) асноўныя палажэнні, план, заўвагі, прыклады;

в) прыклады, заўвагі, план, асноўныя палажэнні;

г) план, прыклады, асноўныя палажэнні, заўвагі;

д) асноўныя палажэнні, заўвагі, прыклады, план.

17. Маўленчыя формулы для пераходу паміж структурнымі часткамі звычайна:

а) фіксуюцца ў канспекце прачытанай крыніцы;

б) фіксуюцца ў канспекце будучай прамовы;

в) фіксуюцца і ў канспекце прачытанай крыніцы, і ў канспекце будучай прамовы;

г) не фіксуюцца ні ў канспекце прачытанай крыніцы, ні ў канспекце будучай прамовы.

18. Пры пошуку галоўнай інфармацыі тэксту больш пільную ўвагу раяць надаваць:

а) асноўнай частцы;

б) уступу;

в) заключэнню.

19. Пры канспектаванні звычайна:

а) менш трывала запамінаюцца перафармуляваныя думкі;

б) менш трывала запамінаюцца думкі, дакладна выпісаныя з крыніцы;

в) дакладна выпісаныя з крыніцы і перафармуляваныя думкі запамінаюцца з аднолькавай ступенню трываласці.

20. Ствараць канспект крыніцы:

а) больш рацыянальна пры паўторным чытанні;

б) больш рацыянальна пры першасным чытанні;

в) аднолькава эфектыўна пры першасным ці пры паўторным чытанні.

21. Канспект крыніцы звычайна:

а) змяшчае ў сабе прыклады;

б) пазбаўлены прыкладаў;

в) можа змяшчаць ці не змяшчаць у сабе прыклады.

22. Лічыцца, што ў працэсе працы над прамовай выпіскі:

а) лепш рабіць на абодвух баках паперы;

б) могуць рабіцца і на адным, і на абодвух баках паперы без уплыву на ступень паспяховасці падрыхтоўкі;

в) лепш рабіць на адным баку паперы.

23. Скарачэнні мэтазгодна:

а) шырэй ужываць у канспекце прачытанай крыніцы;

б) шырэй ужываць у канспекце будучай прамовы;

в) аднолькава шырока ўжываць і ў канспекце прачытанай крыніцы, і ў канспекце будучай прамовы;

г) імкнуцца як мага менш ужываць і ў канспекце прачытанай крыніцы, і ў канспекце будучай прамовы.

24. Пры вывучэнні крыніцы:

а) менш рацыянальна план ствараць на аснове канспекта;

б) менш рацыянальна канспект ствараць на аснове плана;

в) аднолькава магчымы абодва варыянты.

25. Пры падрыхтоўцы зместу выступлення:

а) любому прамоўцы, у тым ліку нефілолагу, карысна звяртацца да энцыклапедычных слоўнікаў;

б) любому прамоўцы-нефілолагу карысна звяртацца да энцыклапедычных слоўнікаў, а філологу – да лінгвістычных;

в) любому прамоўцы, у тым ліку нефілолагу, карысна звяртацца і да энцыклапедычных, і да лінгвістычных слоўнікаў.

26. Лічыцца, што пры знаёмстве з літаратурай ў ходзе падрыхтоўкі прамовы:

а) папярэднічаць яму павінен спецыяльны час для самастойнага асэнсавання тэмы;

б) завершыць яго павінен спецыяльны час для самастойнага асэнсавання тэмы;

в) спецыяльны час для самастойнага асэнсавання тэмы павінен і папярэднічаць вывучэнню літаратуры, і завершыць яго;

г) не патрабуецца спецыяльнага часу для самастойнага асэнсавання тэмы, якое ажыццяўляецца спадарожна вывучэнню літаратуры.

27. Вызначце, у якім з выпадкаў сістэмы запісу пры падборы матэрыялу да прамовы правільна размеркаваны па ступені памяншэння рацыянальнасці:

а) у сшытку, на картках, на асобных лістах паперы;

б) на картках, на асобных лістах паперы, у сшытку;

в) у сшытку, на асобных лістах паперы, на картках;

г) на картках, у сшытку, на асобных лістах паперы;

д) на асобных лістах паперы, на картках, у сшытку.

## Варыянт 2

1. У паспяховым выступленні абавязкова павінна прысутнічаць:

а) толькі новая для слухачоў інфармацыя;

б) інфармацыя, абсалютна новая ў пазнанні праблемы ўвогуле;

в) і новая інфармацыя, і ўжо вядомая слухачам;

г) пераважна новая для слухачоў інфармацыя і нейкія адно-два вядомыя палажэнні;

д) толькі вядомая для слухачоў інфармацыя ў новым асвятленні.

2. Пры падборы матэрыялу для адказнага выступлення больш мэтазгодна грунтавацца:

а) на адной крыніцы;

б) на 1–2 крыніцах;

в) на некалькіх крыніцах.

3. У невялікім выступленні:

а) звычайна больш выйгрышна закрануць мноства разнастайных аспектаў;

б) звычайна больш выйгрышна абмежавацца мінімальнай колькасцю аспектаў разгляду тэмы;

в) можа быць аднолькава выйгрышным ці аглядна закрануць мноства разнастайных аспектаў, ці падрабязней спыніцца на іх мінімальнай колькасці.

4. Падбор матэрыялу да выступлення Вы пачнеце:

а) гутаркай з кампетэнтнай асобай;

б) праглядам літаратуры па тэме;

в) пошукам у электроннай сетцы Internet;

г) адпаведнымі назіраннямі;

д) роздумам, прыпамінаннем, працай уяўлення;

е) набыццём уласнага вопыту ў патрэбнай галіне.

5. Спасылкі на асабісты вопыт выступоўцы ў закранутай галіне:

а) па большай частцы зацікаўліваюць слухачоў;

б) па большай частцы адштурхоўваюць слухачоў як праява нясціпласці і эгацэнтрызму прамоўцы;

в) могуць у роўнай ступені зацікавіць ці адштурхнуць слухачоў, у залежнасці ад іх уласнага жыццёвага вопыту.

6. Каталог, які групуе літаратуру па розных навуковых галінах, завецца:

а) сістэматычным;

б) прадметным;

в) тэматычным.

7. Вызначце паслядоўнасць, у якой больш рацыянальна звяртацца да наступных крыніц па тэме выступлення:

а) падручнік для ВНУ, адзін з раздзелаў якога прысвечаны тэме выступлення; аспектны артыкул па аднаму з пытанняў тэмы; манаграфія 1972 г. выдання; манаграфія 1998 г. выдання; навукова-папулярная брашура; метадычны дапаможнік для выкладчыкаў, частка якога змяшчае парады па арганізацыі навучання студэнтаў дадзенай тэме;

б) аспектны артыкул па аднаму з пытанняў тэмы; манаграфія 1998 г. выдання; манаграфія 1972 г. выдання; метадычны дапаможнік для выкладчыкаў, частка якога змяшчае парады па арганізацыі навучання студэнтаў дадзенай тэме; падручнік для ВНУ, адзін з раздзелаў якога прысвечаны тэме выступлення; навукова-папулярная брашура;

в) манаграфія 1972 г. выдання; манаграфія 1998 г. выдання; падручнік для ВНУ, адзін з раздзелаў якога прысвечаны тэме выступлення; метадычны дапаможнік для выкладчыкаў, частка якога змяшчае парады па арганізацыі навучання студэнтаў дадзенай тэме; навукова-папулярная брашура; аспектны артыкул па аднаму з пытанняў тэмы;

г) падручнік для ВНУ, адзін з раздзелаў якога прысвечаны тэме выступлення; манаграфія 1998 г. выдання; манаграфія 1972 г. выдання; аспектны артыкул па аднаму з пытанняў тэмы; навукова-папулярная брашура; метадычны дапаможнік для выкладчыкаў, частка якога змяшчае парады па арганізацыі навучання студэнтаў дадзенай тэме;

д) аспектны артыкул па аднаму з пытанняў тэмы; манаграфія 1972 г. выдання; навукова-папулярная брашура; манаграфія 1998 г. выдання; метадычны дапаможнік для выкладчыкаў, частка якога змяшчае парады па арганізацыі навучання студэнтаў дадзенай тэме; падручнік для ВНУ, адзін з раздзелаў якога прысвечаны тэме выступлення.

8. Перыёдыку цікавага для прамоўцы профілю звычайна:

а) пажадана праглядаць у першую чаргу, да знаёмства з кнігамі па тэме выступлення;

б) пажадана праглядаць пасля знаёмства з адпаведнай кнігапрадукцыяй;

в) магчыма праглядаць да ці пасля знаёмства з кнігамі, без уплыву на характар падрыхтоўкі.

9. Вызначце, у якім з пералікаў правільна адасоблены спосабы чытання, якія адрозніваюцца па розных крытэрыях:

а) праглядальнае, вывучальнае; хуткаснае, выбіральнае, азнаямляльнае, цэласнае;

б) азнаямляльнае, вывучальнае; праглядальнае, выбіральнае, цэласнае; хуткаснае;

в) праглядальнае, выбіральнае, азнаямляльнае, вывучальнае; хуткаснае, цэласнае;

г) праглядальнае, азнаямляльнае, вывучальнае; выбіральнае, цэласнае, хуткаснае;

д) праглядальнае, азнаямляльнае, вывучальнае; выбіральнае, цэласнае; хуткаснае.

10. Пра наяўнасць у кнізе вялікай колькасці ідэй сігналізуе:

а) вялікая колькасць малых абзацаў;

б) малая колькасць вялікіх абзацаў;

в) сярэдняя колькасць сярэдніх па памеру абзацаў;

г) малая колькасць сярэдніх па памеру абзацаў.

11. Пагадзіцца са сцверджаннем *Чым павольней чалавек чытае, тым лепш ён засвойвае матэрыял*:

а) можна;

б) нельга;

в) можна, але толькі не ў дачыненні да празмерна замаруджанай хуткасці чытання.

12. Звычка весці пры чытанні па радках ручкай ці алоўкам (без падкрэслівання), каб засяродзіць увагу:

а) лічыцца рацыянальнай;

б) лічыцца нерацыянальнай;

в) істотна не ўплывае на хуткасць і якасць чытання.

13. Пры падрыхтоўцы навучальнай прамовы настаўніку варта аддаць перавагу перш за ўсё знаёмству:

а) з дадатковай уласна навуковай літаратурай;

б) з рэфератыўнымі часопісамі па дадзенаму напрамку навукі;

б) з навукова-папулярнай літаратурай.

14. Пошук падтэксту (недавыказанага і неадпаведнасці выказанага таму, што маецца на ўвазе) можа быць неабходным галоўным чынам пры чытанні тэкстаў:

а) навуковых;

б) навучальных;

в) навукова-папулярных;

г) мастацкіх;

д) публіцыстычных.

15. Пры падрыхтоўцы да выступлення:

а) мае рацыю складаць канспект прачытаных крыніц;

б) мае рацыю складаць канспект сваёй будучай прамовы;

в) мае рацыю складаць канспект і прачытаных крыніц, і будучай прамовы;

г) магчыма абысціся без складання канспектаў прачытанага і сваёй прамовы.

16. Падзагалоўкі раздзелаў кнігі найбольш непасрэдна спрыяюць стварэнню:

а) плана;

б) тэзісаў;

в) цытатных выпісак;

г) канспекта.

17. Канспект крыніцы:

а) аднолькава магчыма ствараць пры першасным ці паўторным чытанні;

б) варта ствараць адразу ж, пры першасным успрыманні тэксту;

в) варта ствараць пры паўторным чытанні.

18. Галоўная інфармацыя тэксту больш шчыльна канцэнтруецца:

а) ва ўступе;

б) у асноўнай частцы;

в) у заключэнні.

19. У канспектах звычайна фіксуюцца:

а) правілы;

б) фармулёўкі заканамернасцей;

в) паўторы думак;

г) аўтарскія адхіленні;

д) азначэнні.

20. Уключаць у сябе прыклады канспект крыніцы:

а) павінен;

б) не павінен;

в) можа ўключаць ці не ўключаць, у залежнасці ад характару тэксту;

г) можа ўключаць ці не ўключаць, у залежнасці ад характару прамовы.

21. Пры вывучэнні крыніцы:

а) больш мэтазгодна план тэксту вылучаць з яе канспекта;

б) больш мэтазгодна канспект ствараць на аснове яе плана;

в) аднолькава магчымы абедзве паслядоўнасці.

22. Звычайна:

а) больш разгорнутыя ўступ і заключэнне мае канспект будучай прамовы;

б) канспект прачытанай крыніцы і будучай прамовы не маюць адрозненняў па ступені разгорнутасці;

в) больш разгорнутыя ўступ і заключэнне мае канспект прачытанай крыніцы;

г) канспект і прачытанай крыніцы, і будучай прамовы павінны быць максімальна сціслымі.

23. Пры канспектаванні рымская нумарацыя:

а) можа ўжывацца для адзначэння і буйных, і меншых частак матэрыялу ў залежнасці ад ступені складанасці кампазіцыі;

б) звычайна ўжываецца для адзначэння буйных частак матэрыялу;

в) звычайна ўжываецца для адзначэння асобных падчастак.

24. Найбольш агульнапрынятая паслядоўнасць граф канспекта пры запісе ў таблічнай форме:

а) прыклады, план, асноўныя палажэнні, заўвагі;

б) асноўныя палажэнні, план, заўвагі, прыклады;

в) план, асноўныя палажэнні, прыклады, заўвагі;

г) план, прыклады, асноўныя палажэнні, заўвагі;

д) асноўныя палажэнні, прыклады, заўвагі, план.

25. Пры канспектаванні па большай частцы:

а) лепш запамінаюцца думкі, дакладна выпісаныя з крыніцы;

б) лепш запамінаюцца перафармуляваныя палажэнні;

в) перафармуляваныя і дакладна выпісаныя думкі запамінаюцца з аднолькавай ступенні верагоднасці.

26. Сістэмы запісу пры падрыхтоўцы да прамовы па ступені павелічэння рацыянальнасці лічыцца дакладным размеркаваць так:

а) у сшытку, на картках, на асобных лістах паперы;

б) на картках, на асобных лістах паперы, у сшытку;

в) у сшытку, на асобных лістах паперы, на картках;

г) на картках, у сшытку, на асобных лістах паперы.

27. Матэрыял, які вывучае прамоўца перад выступленнем, звычайна павінен:

а) перавышаць аб’ём выступлення, каб забяспечыць грунтоўную падрыхтаванасць прамоўцы;

б) быць строга суразмерным аб’ёму выступлення;

в) быць крыху меншым за аб’ём выступлення, каб даваць прастору для творчасці прамоўцы і жывога суразмоўніцтва з аўдыторыяй;

г) крыху перавышаць аб’ём выступлення толькі ў найбольш адказных выпадках.